## ДЛЯ ВАС, АБІТУРЫЕНТЫ

Менш трох месяцаў засталося да ўступных экзаменаў на І курс нашага універсітэта дзённага аддзялення. На завочны факультэт яны пачнуцца яшчэ раней — з 17-га чэрвеня. Многіх з тых, хто яшчэ вучыцца ў школе, сярэдніх спецыяльных навучальных установах і ў сістэме прафтэхадукацыі, а таксама тых, хто ўжо працуе, хвалюе пытанне аб набыцці вышэйшай адукацыі. Вельмі важным для кожнага з'яўляецца тое, каб не памыліцца ў выбары ВНУ і будучай прафесіі.

Сёлета, як і ў папярэднія гады, будзе шмат жадаючых паступіць і ў наш універсітэт. Тым больш, што цяпер паехаць на вучобу за межы Беларусі — справа не простая і будзе каштаваць вялікіх сродкаў. Для абітурыентаў, якія маюць намер паступаць у ГДУ, на старонках нашай газеты № 5 за 5 сакавіка мы апублікавалі пералік спецыяльнасцей, якія можна атрымаць на стацыянарнай форме навучання і завочна, а таксама экзаменаў па кожнай спецыяльнасці. У газеце № 7 за 6 красавіка апублікаваны правілы прыёму студэнтаў на І курс завочнага факультэта, а ў сённяшнім нумары мы змясцілі такія ж правілы прыёму на дзённае аддзяленне.

З наступнага навучальнага года на эканамічным факультэце пачынаецца падрыхтоўка спецыялістаў па новай спецыяльнасці: «Эканоміка і кіраванне: менеджмент». Аб ёй у сённяшнім нумары «Гомельскага універсітэта» расказвае дэкан эканомфака дацэнт Т. В. Карпей.


# Гомельскі універсітэт



ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

№ 8 (851) | Аўторак, 20 красавіка 1993 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана 1 руб.


## НА МІЖНАРОДНАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ Ў ІТАЛІІ

**ЗША і Англія, Японія і КНР, Польша і Фінляндыя, іншыя краіны Заходняй Еўропы пазначаны на карце зносін вучоных нашага універсітэта са сваімі замежнымі калегамі. А з мінулага тыдня да зробленага няпоўнага пераліку дабавілася і Італія. Тут у г. Трэнта адбылася міжнародная навуковая канферэнцыя «Тэорыі груп». У яе рабоце ўдзельнічаў і выступіў з дакладам рэктар ГДУ доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, член-карэспандэнт АН Беларусі Л. А. Шамяткоў.**

## АДНЕСЕНЫ ДА І КАТЭГОРЫІ

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь прыняў распараджэнне № 245р ад 31 сакавіка 1993 года, у якім прынята прапанова Мінадукацыі, падтрыманая Дзяржэканомпланам, Мінфінам і Дзяржкампрацы аб аднясенні навукова-даследчага сектара нашага універсітэта да І катэгорыі па аплаце працы работнікаў навукі. Яна будзе ажыццяўляцца ў межах нарматыва фонду заработнай платы, зацверджанага для навукова-даследчых устаноў Мінадукацыі.

## ВЫСТУПІЎ ДЭПУТАТ ПАРЛАМЕНТА

Насычаным быў парадак дня пашыранага пасяджэння рэктарата, якое адбылося 13 красавіка. Са своеасаблівай справаздачай на ім выступіў былы прарэктар нашага універсітэта дэпутат Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь Л. Н. Сечка. Ён гаварыў аб глыбокай крызіснай сацыяльна-эканамічнай і палітычнай сітуацыі, якая склалася ў Беларусі за апошні час, аб некаторых выніках работы парламента, адказаў на зададзеныя пытанні.

Затым было разгледжана пытанне аб увядзенні кваліфікацыйнага экзамена па беларускай мове на педагагічных спецыяльнасцях. Пры яго абмеркаванні выступілі першы прарэктар прафесар М. В. Селькін, загадчыца вучэбнага аддзела Н. І. Папкова, дэканы факультэтаў.

Як мы паведамлялі ўжо, 29 сакавіка на пасяджэнні рэктарата было разгледжана пытанне аб рабоце ў інтэрнатах і падпісаны адпаведны загад па універсітэту аб яе паляпшэнні. На гэты раз размова ішла аб тым, як выконваюцца прадугледжаныя ім мерапрыемствы.

Рэктарат абмеркаваў таксама ход падрыхтоўкі да правядзення ўступных экзаменаў на новы навучальны год.

## 1 МАЯ—ДЗЕНЬ АБАРОНЫ ПРАЦЫ

Пераўтварыць Свята працы 1 Мая ў Дзень абароны працы прапанаваў прэзідыум Савета Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі. У прынятай у сувязі з гэтым пастанове рэкамендуецца прафсаюзным камітэтам і Саветам усіх узроўняў правесці 1 Мая мітынгі, дэманстрацыі пад лозунгамі салідарнасці працоўных, абароны правоў кожнага на працу і забеспячэнне чалавечых умоў жыцця. А ў працоўных калектывах прадугледжваюцца ўшанаванні перадавікоў і ветэранаў вытворчасці, аказанне неабходнай дапамогі інвалідам працы і сем'ям людзей, якія загінулі на рабочым месцы.

У Мінску 1 мая намячаецца шэсце-мітынг, прысвечаны Дню абароны працы.

**БЕЛІНФАРМ.**

## АБ ПАМЕРАХ НОВЫХ СТЫПЕНДЫЙ

Для выканання пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 20.12.91 г. № 482, ад 22.02.93 г. № 89, ад 22.03.93 г. № 167 і ў мэтах упарадкавання выплат стыпендый Дзяржаўны камітэт па працы і сацыяльнай абароне насельніцтва і Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь пастанавілі:

зацвердзіць і ўвесці з 1 красавіка 1993 г. новыя памеры дзяржаўных стыпендый.

У вышэйшых навучальных установах: паспяваючым студэнтам у памеры 80% мінімальнай заработнай платы;

студэнтам з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў і знаходзіліся пад апекай (апякунствам) і дасягнулі 18-гадовага ўзросту да 1.03.91 г., не атрымоўваючым штомесячныя грашовыя выплаты на атрыманне апякаемых (згодна пастановы Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 5.02.91 г.) і выхоўваемых у сем'ях сваякоў, не аформіўшых апеку, у памеры 110% мінімальнай заработнай платы;

студэнтам з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апякунства бацькоў, апекуноў, а таксама дзецям ваеннаслужачых, якія загінулі пры выкананні інтэрнацыянальнага абавязку, і знаходзяцца на поўным дзяржаўным забеспячэнні — 65% мінімальнай заработнай платы;

студэнтам, якія знаходзяцца ў адпаведнасці з рашэннем урада на поўным дзяржаўным забеспячэнні, у размеры 35% мінімальнай заработнай платы;

студэнтам з ліку воінаў-інтэрнацыяналістаў у памеры мінімальнай заработнай платы, з іх тым, хто знаходзіцца на поўным дзяржаўным забеспячэнні, — 60% мінімальнай заработнай платы;

студэнтам з ліку былых ваеннаслужачых, якія сталі інвалідамі ў выніку ранення, кантузіі, увечча або захворвання, атрыманага пры выкананні інтэрнацыянальнага абавязку, у памеры 120% мінімальнай заработнай платы, з іх студэнтам, якія знаходзяцца на поўным дзяржаўным забеспячэнні, — 75% мінімальнай заработнай платы;

студэнтам, якія вучацца па спецыяльнасці 01.01. «Матэматыка» у дзяржаўных універсітэтах, 01.02. «Прыкладная матэматыка», 01.03. «Механіка», 22.04. «Праграмнае забеспячэнне вылічальнай тэхнікі і аўтаматызаваных сістэм», 06.09. «Эканамічная кібернэтыка» у памеры мінімальнай заработнай платы незалежна ад курса навучання;

студэнтам за асаблівыя поспехі ў вывучэнні асобных дысцыплін і навукова-тэхнічнай творчасці можа ўстанаўлівацца персанальная стыпендыя савета ВНУ ў памеры 115% мінімальнай заработнай платы;

імянныя стыпендыі ўсіх відаў — 140% мінімальнай заработнай платы;

Студэнтам па выніках экзаменацыйнай сесіі за добрыя і выдатныя адзнакі размер стыпендыі павялічваецца на 20%, а маючым толькі выдатныя адзнакі — на 40% ад устаноўленых памераў.

Дзяржаўныя прадпрыемствы, арганізацыі і ўстановы, якія заключылі індывідуальныя дагаворы, выплачваюць за кошт сваіх сродкаў паспяваючым студэнтам павышаную не менш чым на 30%, пры стажу работы больш трох гадоў — не менш чым на 50% у параўнанні з памерамі дзяржаўных стыпендый, устаноўленых для адпаведных катэгорый студэнтаў.

Слухачам падрыхтоўчых аддзяленняў вышэйшых навучальных устаноў з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апякунства бацькоў, а таксама дзяцей ваеннаслужачых, якія загінулі пры выкананні інтэрнацыянальнага абавязку, і знаходзяцца на поўным дзяржаўным забеспячэнні, у памеры 50% мінімальнай заработнай платы;

памер стыпендыі аспірантам ВНУ і навукова-даследчых устаноў, якія паступілі на вучобу непасрэдна пасля заканчэння навучальнай установы, а таксама з практычнай работы са стажам да аднаго года пасля заканчэння навучальнай установы, і замежным аспірантам устанаўліваецца ў памеры 200% мінімальнай заработнай платы;

аспірантам вышэйшых навучальных устаноў і навукова-даследчых устаноў, паступіўшым на вучобу з практычнай работы па профілю навуковай спецыяльнасці са стажам работы звыш 1 года стыпендыі выплачваюцца ў памеры пасадавых акладаў (ставак), разлічаных зыходзячы з устаноўленага Саветам Міністраў памеру тарыфнай стаўкі 1 разрада і тарыфнага каафіцыента, вызначаемага па Адзінай тарыфнай сетцы рабочых і служачых народнай гаспадаркі, адпавядаючага пасадзе, займаемай да паступлення ў аспірантуру па профілю навуковай спецыяльнасці.

## ХРОНІКА

Пасля конкурснага выбрання скончыліся пяцігадовыя паўнамоцтвы дэкана біялагічнага факультэта дацэнта В. Я. Верамейчыка. На вакантную пасаду выконваючым абавязкі дэкана названага факультэта загадам па універсітэту назначаны кандыдат біялагічных навук, дацэнт кафедры хіміі Сцяпан Фёдаравіч Алешка.

• • •

Па ўласнай заяве ў сувязі са станам здароўя з пасады загадчыка кафедры аўтаматызаваных сістэм апрацоўкі інфармацыі фізічнага факультэта вызвалены дацэнт А. І. Іванюк. Выконваючым абавязкі загадчыка гэтай кафедры назначаны яе дацэнт кандыдат тэхнічных навук Алег Міхайлавіч Дземідзенка.

## ВІНШУЕМ!

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, калектыў выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў фізічнага факультэта горача віншуюць загадчыка кафедры тэарэтычнай фізікі дацэнта МАКСІМЕНКУ Мікалая Васільевіча з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені доктара фізіка-матэматычных навук.

• • •

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта дэканат, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты філалагічнага факультэта горача віншуюць асістэнта кафедры беларускай мовы БОБРЫКА Уладзіміра Андрэевіча з зацвярджэннем яго ў вучонай ступені кандыдата філалагічных навук.

# РАДАЎНІЦА

Радаўніца (Радуніца, радуніцкія Дзяды) займае важнае месца ў велікоднай абраднасці і адзначаецца ў аўторак пасля велікоднага тыдня. Гэта веснавое язычніцкае свята ўсходніх славян, звязанае з культам продкаў, своеасаблівы рытуал памінання памерлых, вытокі якога знаходзяцца ў першабытна-абшчынным ладзе.

Звычай ушанавання продкаў быў арганічнай часткай жыцця жывых, і, як сведчаць шматлікія факты, пэўным чынам суадносіўся з канкрэтнымі датамі календара — народнага і царкоўнага. Вучоныя спрабавалі знайсці адказ на пытанне, які характар мела гэта сувязь. Тлумачэнні былі самымі рознымі. Адны спрабавалі такую прымеркаванасць, правязанасць да календара абумовіць псіхалагічным фактарам (зіма — смерць — памерлыя); другія бачылі гэтую «асацыяцыю ідэй» (С. А. Токараў) у тэзісе «вясенняе адраджэнне прыроды — надзея на ўваскрэсенне памерлых»; трэція лічылі, што памінальныя абрады, як і каляндарныя, маюць аграрна-магічную функцыю (імі імкнуліся ўздзейнічаць на ўраджай).

У адрозненне ад іншых дзён памінання на Радаўніцу (аўторак на Фаміным тыдні) звычайна пасля паўдня кожная сям'я памінала памерлых родзічаў на могілках, якія папярэдне прыбіраліся, прыводзіліся ў парадак. Святочна апранутыя людзі (старыя, малыя) моўчкі рассаджваліся каля белага абруса, якім засцілалі насып. Стравы рыхтаваліся разнастайныя — мяса, пафарбаваныя яйкі, сыр, куцця, хлеб, масла, кулічы, гарэлка. Названыя стравы абавязкова адкладваюцца ці адліваюцца для нябожчыкаў, каб засведчыць павагу да іх з боку жывых.

На тэрыторыі Усходняй Беларусі Радуніца падмянялася траецкімі дзядамі. На Палессі паміналі нябожчыкаў у чацвер велікоднага тыдня. Радаўніца звязвалася з праваслаўным святам уваскрэсення Хрыстова.

З Радаўніцай было звязана шмат народных павер'яў і назіранняў. Напрыклад, забаранялася ў гэты дзень садзіць і сеяць, меркавалі аб добрым ураджаі, калі прыход Радаўніцы супадаў з маладзіком.

**В. НОВАК,**
**старшы выкладчык кафедры беларускай літаратуры.**

## УВАГА!

Неабходна тэрмінова звярнуцца да намесніка глоўнага ўрача паліклінікі № 6 (кабінет № 21) тым студэнтам, якія маюць трэцюю групу крыві рэзус — адмоўны.

Дапамога неабходна для выратавання жыцця дзіцяці.

**МЕДПУНКТ УНІВЕРСІТЭТА.**

**ЛІДЭР**




**Вось ужо каля паўгода існуе рубрыка «Лідэр». За гэты час апублікавана некаторая колькасць матэрыялаў аб розных музыкальных стылях і выканаўцах. На жаль, канцэртна-гастрольнае жыццё нашага горада за гэты час не вызначалася разнастайнасцю прыязджаючых. Таму сёння я адкажу на найбольш часта задаваемыя пытанні, якія я атрымаў па тэлефону ў розны час (тэлефон кафедры рускай літаратуры — 56-32-40). Я, як і раней, чакаю вашых званкоў і вашых заявак на апублікаванне тых або іншых матэрыялаў.**

**З павагай да маіх чытачоў, — вядучы рубрыкі П. БЕСЯЦКІ.**

# АДКАЗ ЧЫТАЧУ

**— Што здарылася з групай АСІДС?**

— Групу пакінуў Малькольм Янг. Апошні альбом «Зе Рэйзар Эйдж» («Лязо брытвы») група запісвала без яго. На барабанах іграў Крыс Слэйд. Гэта яго другая работа (нагадаю, з ім запісваўся альбом 1988 года «Разбі свае відэа») у складзе групы. Раней Слэйд выступаў у групе «Мэнфрэд Мэн Эрт Бэнд», «Юрайе Хіп» і «Фірм». Бас-гітарыст АСІДС Кліф Вільямс запісаў дэматэйп і збіраецца выпусціць сольны дыск. Тым, каму пашчасціла ўбачыць АСІДС на Тушынскім полі, надоўга запамятаюць відовішчнае шоу з іх удзелам.

**— Што новага з групай «Ганз»н«Роузіс»?**

— Новага не так ужо і шмат. Эксл Роуз прайшоў сеанс лячэння ад дэпрэсій. Шырока рэкламуецца прыезд групы ў пачатку мая ў Маскву і прадстаячыя канцэрты. Дарэчы, у пачатку красавіка ў Маскве адбылося яшчэ адно маляўнічае шоу з прыездам «Айран Мейдэн»... А пакуль у арсенале ў «Ганз»н«Роузіс» альбом «Юс Е Ілюжэн», які вось ужо больш года знаходзіцца ў вышэйшых радках хіт-парада.

**— Раскажыце, калі ласка, пра Ігара Жырнова. Гэта мой любімы гітарыст.**

— З задавальненнем! Ігар Жырноў працуе зараз у групе «Чорны абеліск». Гэта праект яе творца Анатоля Крупнова (бас). Да нядаўняга часу Крупноў выступаў у групе «Шах», а ў пачатку 1992 года вырашыў рэаніміраваць састаў «Ч. О.». Іменна дзякуючы сола-гітары І. Жырнова пласцінка «Яшчэ адзін дзень», выдадзеная фірмай «Біз Інтэрпрайзіс» і набыла тое аптымальнае гучанне, якое з'яўляецца фірменным знакам «Абеліска» сёння. «Мы не іграем трэш, мы не іграем дэс, мы іграем нармальную цяжкую музыку», — сказаў А. Крупноў у адным з інтэрв'ю.

**— Скажыце, чаму не чутна «Модэн Токін»?**

— Інфармацыя аб іх не даходзіць вось ужо каля 3-х гадоў. Запісаўшы 6 альбомаў (апошні «У садзе Венеры») і 4 зборнікі лепшых песень, група, здаецца, «Канула ў лету» — Болен стварыў «Блю сістэм» і заняты сольнымі праектамі і прадзюсіраваннем іншых выканаўцаў, Андэрс запісвае песні разам са сваёй жонкай Норай.

**— Чым займаецца група «Наўцілус-Пампіліус»?**

— Расказ аб апошняй рабоце гэтай групы ў адным з бліжэйшых нумароў газеты «Гомельскі універсітэт».

**— Раскажыце аб групе «Калінаў Мост».**

— Група выпусціла 2 пласцінкі: «Выварацень» (фірма «Эс-эн-сі») і «Дарза» (фірма «Экакультура»). У бліжэйшым будучым выходзіць трэці дыск «Узарэнь» на «Марс-Эс-эн-сі». А наогул, у планах — больш падрабязны расказ аб Д. Рэвякіне і яго групе «Калінаў Мост». Чытайце «Гомельскі універсітэт»!

Прашу прабачэння ў тых, каму я не змог даць адказ у гэтым невялікім артыкуле — але не адчайвайцеся. Вашыя заяўкі і просьбы я пастараюся выканаць і расказаць аб вашых кумірах. Наперадзе расказы аб «Кінгдом Кам» і Лені Вольфе; «А-Ха»; «Скорпіонс», Ігары Купрыянаве; «Майстры», «Арыі», У. Асмолаве, Э. Куперы.

# АЙЦЕЦ СТЭФАН — У СТУДЭНТАЎ





Выступае айцец Стэфан.
Фота У. Чысціка.

Яшчэ некалькі год назад такое цяжка было б нават уявіць. Але падзея гэтая ўсё ж адбылася: у госці да студэнтаў-філолагаў прыйшоў айцец Стэфан — настаяцель Петрапаўлаўскага сабора, благачынны Гомельскай акругі. Сустрэча святара са студэнтамі прыйшлася на пярэдадзень Вялікадня (Пасхі) — свята, якое не так даўно стала дзяржаўным.

Сваю гаворку айцец Стэфан пачаў менавіта з расказа аб гісторыі гэтага найвялікшага для ўсіх праваслаўных хрысціян свята. Дарэчы, не толькі аб Вялікадні ішла размова: наш госць падрабязна расказаў пра Лазараву суботу, Вербную нядзелю, Чысты чацвер, Вялікую пятніцу і Радаўніцу. Быццам бы і ведаем мы зараз ужо нямала пра традыцыйныя народныя святы, у тым ліку і пра Вялікдзень, але пачуць аб усім гэтым «з першых вуснаў», ад святара большасці з прысутных яшчэ не давodзілася. Тым больш што (і гэта вельмі добра адчувалася) перад намі выступаў сапраўды майстар слова, які да таго ж выдатна валодае ўменнем уздзеяння на людзей. Таму і слухалі студэнты надзвычай уважліва няспешную, разважлівую гутарку айца Стэфана. А яна, як хутка высветлілася, была прысвечана не толькі праваслаўным святам; пераканаўча, са шматлікімі прыкладамі і каментарыямі гаварыў святар аб нашым сённяшнім цяжкім жыцці, аб тых праблемах, з якімі сустракаецца моладзь.

На гэтым, аднак, сустрэча не скончылася. Спачатку нясмела, крыху саромеючыся, а потым усё больш актыўна студэнты пачалі задаваць свайму госцю пытанні. А былі яны самыя розныя: аб адносінах праваслаўнай царквы да баптыстаў і крышнаітаў, да экстрасэнсаў, калдуноў і НЛА, да «святых пісьмаў» і скананні свету. Цікавілі прысутных таксама адносіны паміж праваслаўнай царквой і органамі дзяржаўнай улады, паміж царквой і арміяй, паміж праваслаўнай і каталіцкай абшчынамі нашага горада. Былі пытанні і пра «дзень ангела», і пра рэканструкцыю Петрапаўлаўскага сабора, і пра абрад вянчання, і пра горкую «зорку палынь», якая ўпамінаецца ў Бібліі і лічыцца, на думку многіх, прадказаннем Чарнобыля...

Натуральна, што ніводнае пытанне не засталося без адказу. Сустрэча, як і чакалася, не была сухой і акадэмічнай: вялася шчырая, адкрытая размова разумнага, добразычлівага чалавека са студэнцкай моладдзю. І міжволі падумалася: як жа не хапае нам у гэты смутны час добрага слова, шчырай парады і духоўнай падтрымкі! Як неабходна хоць зрэдку спыняцца ў паўсядзённай мітусні, каб паразважаць аб сэнсе жыцця і сваім прызначэнні!

Відавочнай была і чыста прафесійная карысць для студэнтаў-філолагаў ад сустрэчы з айцом Стэфанам: як вядома, у школьны курс літаратуры ўведзена вывучэнне Бібліі. Пройдзе няшмат часу, і сённяшнія філолагі стануць настаўнікамі. Рыхтуючыся да чарговага ўрока, яны абавязкова ўспомняць, як аднойчы да іх у аўдыторыю прыйшоў незвычайны настаўнік — айцец Стфэан, каб расказаць аб Вялікадні, а значыць — аб перамозе жыцця над смерцю, святла над цемрай, дабра над злом...

**Ул. КОВАЛЬ,**
**загадчык кафедры рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства.**

## ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

### АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ВАКАНТНЫХ ПАСАД ПА КАФЕДРАХ:

— дыферэнцыйных ураўненняў — дацэнта;
— алгебры і геаметрыі — дацэнта (2);
— нямецкай і французскай моў — выкладчыка;
— вышэйшай матэматыкі — дацэнта;
— тэорыі і методыкі фізічнай культуры — ст. выкладчыка;
— лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту — ст. выкладчыка;
— заалогіі і аховы прыроды — дацэнта.

Тэрмін падачы заяў — не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699 г. Гомель, вул. Савецкая, 104.

**Рэктарат.**

**Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты матэматычнага факультэта глыбока смуткуюць з выпадку смерці доктара фізіка-матэматычных навук, прафесара, былога загадчыка кафедр матэматычных праблем кіравання, ВМ і праграміравання пенсіянера РУБАНІКА Васіля Паўлавіча і выказваюць сваё спачуванне сям'і і родным нябожчыка.**


**Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.**

**«Гомельскі універсітэт» — газета Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф. Скарыны.**

**Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.**

**Рэгістрацыйны № 221**

**Спонсары газеты — Цэнтральны райсавет народных дэпутатаў г. Гомеля; НВП «Сучасныя тэхналогіі», прафком студэнтаў.**

**Гомельская фабрыка «Палесдрук» Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь г. Гомель, Савецкая, 1.**

**Рэдактар Ул. БАЛОГА.**

**Аб'ём 1 друк. арк.**
**Тыраж 1.500 экз.**
**Заказ 249.**

**Падпісана да друку ў 16.00.**